# БРЫЛЕЎСКАЯ МІНУЎШЧЫНА

Выдаецца з верасня 2006 г.

ГРАМАДСКА-ГІСТАРЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

№ 1 ( 1 ) верасень 2006 г.



Фота В. Яцковай



## Тайна Брылеўскай школы

с.2-3

## КАЛОНКА РЭДАКТАРА



**Дзень добры, шаноўны чытач!**

**Вядома, так і павінна адбывацца: як на дрэве вырастаюць новыя галінкі і лісточкі, так і ад "Брылеўскага летапісу" адпачкавалася новае выданне - бюлетэнь "Брылеўская мінуўшчына". У ім гаворка пойдзе выключна пра гістарычнае мінулае нашых вёсак і наваколля. А мінулае гэтае багатае на розныя падзеі і перакрыжаванні. Трэба толькі перагарнуць старонкі ўспамінаў, абтрэсці пыл са старажытных фаліянтаў, зазірнуць у скарбніцы архіваў, у тым ліку і хатніх, - і ўчарашні дзень наблізіцца да нас. Мы павінны ведаць мінулае, бо без мінулага не бывае будучыні. Калі адчуваешь моц сваіх каранёў, што ўраслі ў родную зямлю, то ніякія вятры і сухавеі ўжо не палохаюць. І жыццёвыя шляхі робяцца лягчэйшымі.**

**І ўжо без тваёй дапамогі, шаноўны аднавясковец, тут не абысціся. Бо толькі агульнымі намаганнямі, талакой, можна ажыццявіць гэтае выданне. І я ўпэўнены, што мы гэта зробім - каб нашы нашчадкі ведалі пра свае вытокі. Ведалі і ганарыліся.**

**Добрага шляху табе, "Брылеўская мінуўшчына"!**





# Тайна Брылеўскай школы

**Надышоў верасень. Па ўсёй Беларусі зазвінелі галасы школьных званкоў, і Краіна Ведаў, як заўсёды, расчыніла свае дзверы. І наша Брылеўская школа вось ужо ў семдзесят дзевяты раз паклала ў свае далоні памкненні і думкі маленькіх брылеўцаў.**

**Шмат што бачылі на сваім вяку сцены гэтай школы і шмат чаго могуць паведаць нам. І мы з заміраннем будзем слухаць гэтыя аповеды…**

**У хатнім архіве Мікалая Дзмітрыевіча Смалякова захавалася неблагая колькасць цікавых фотаздымкаў. Частку гэтага архіва "Брылеўская мінуўшчына" надрукуе ў далейшым на сваіх старонках. А менавіта сёння вашай ўвазе прапануецца здымак, які адлюстраваў адну з гістарычных таямніц Брылеўскай школы.**



*Мікалай Дзмітрыевіч СМАЛЯКОЎ*
**Верасень 2006 г.**

**Гэта выпускны клас 1948 года. Здымак, на першы погляд, звычайны: ля школьнай сцяны ўладкаваліся вучні і настаўнікі і, зазірнуўшы ў аб'ектыў фотаапарата, назаўжды засталіся ў гісторыі. І, відаць, каб аздобіць фон здымка, аднекуль са школы прынеслі ці то коўдру, ці то дывановую дарожку і пачапілі на сцяну за спінамі школьнікаў. І вось тут пачынаецца самае цікавае: на гэтым "задніку" можна ясна ўбачыць чатыры падвоеныя вертыкальныя паласы, а паміж гэтых палос добра чытаецца надпіс на нямецкай мове - *"..OLIZEI 1935"*. Адна літара схавалася за галавой Ганны Міхайлаўны Новікавай, і літара гэта, хутчэй за ўсё, *"Р"*. Такі ж самы вертыкальны надпіс месціцца за спіной Надзеі Цепляковай - можна ўбачыць верхнія лічбы *"35"*. І атрымліваецца, што рэч, якая належыла ў 1935 годзе нямецкай паліцыі, апынулася нейкім чынам у Брылеўскай школе. Хутчэй за ўсё, немцы прывезлі з сабой ў 1941 годзе, а пасля вайны ніхто не звярнуў увагу на гэту акалічнасць. І ў 1948 годзе яна разам з выпускным класам трапіла ў брылеўскую гісторыю.**

***Мікола ЯЦКОЎ.***






***Першы рад, злева направа:*** **Шведаў Уладзімір Клімавіч, Пратасеня Пётр, Пчэльнікаў Міхаіл Яфімавіч, Мяшкоў Іван Яфімавіч, Нядзвецкі Валянцін.**

***Другі рад, злева направа:*** **Абрамовіч Іосіф, Смалякова Ганна Дзямідаўна, Смалярова Валянціна Максімаўна, Смяшкоў Міхаіл, Старавыбарная Зоя Ісакаўна, Рамашкевіч Анастасія Іванаўна.**

***Трэці рад, злева направа:*** **настаўнік Рамашкевіч Міхаіл Афанасьевіч, настаўнік Пацяробкін Карп Фёдаравіч, настаўніца Казлова (Шэйграцава) Надзея Якаўлеўна, дырэктар Пратасеня Іван Якаўлевіч, настаўніца Новікава (Раманава) Ганна Міхайлаўна, настаўніца Галубцова Ганна Ягораўна, Старавыбарная Валянціна Яўсееўна.**

***Чацверты рад, злева направа:*** **Лапаева Ядвіга, Цеплякова Надзея Панасаўна, Раманава Ганна Паўлаўна, Смалякоў Мікалай Дзмітрыевіч, Іосіфава Станіслава, Старавыбарная Аляксандра.**

***Фотаздымак друкуецца ўпершыню.***

# з архіва Мікалая Дзмітрыевіча Смалякова



**7-ы клас Брылеўскай школы 1980-1981 г.г.**

***Злева направа:***
***Рамашкевіч Сяргей, Бірукоў Сяргей, Дзятлікава Святлана, Карась Сяргей, Васіленка Галіна, Юрасава Таццяна, Чумакова Валянціна, Сувалава Святлана, Смалякоў Уладзімір, класны кіраўнік Кавалёва Жана Фёдараўна.***





***Сябры.***
**Сяргей Бірукоў, Уладзімір Смалякоў і Сяргей Рамашкевіч.**
***2-і клас Брылеўскай школы, 1976 г.***

# з архіва Галіны Іванаўны Халмовай




**8-ы клас Брылеўскай школы 1968-1969 г.г.**

***Першы рад, злева направа:*** *Старавыбарная Людміла, Халмова Надзея, Смяшкова Вольга, Шамянкова Таццяна, Смалярова Настасся.*
***Другі рад, злева направа:*** *Мяшкова Настасся, Буглакова Тамара, Раманава Надзея, Калячкова Вера, Багданава Надзея, Радзішэўская Алена, Кастрыца Алена, Куляшова Любоў.*
***Трэці рад, злева направа:*** *Казакоў Уладзімір, Гарнастаеў Валерый, Мяшкоў Міхаіл, Халмоў Вячаслаў, Прохараў Уладзімір, Раманаў Аляксандр, Мураўёў Міхаіл, Магілёўцаў Аляксандр, Буконкін Уладзімір.*



**9-ы клас Брылеўскай школы 1996-1997 г.г.**

***Першы рад, злева направа:*** *Жураўкоў Ігар, Калячкоў Мікалай, Халмоў Андрэй, Баранаў Андрэй.*
***Другі рад, злева направа:*** *Прохарава Вераніка, Ляутка Людміла, Якушка Раіса, Паршнёва Святлана, Самсонава Алеся.*



# Настаўнікі Брылеўскай школы



*__Першы рад, злева направа:__* **Іосіф Дзмітрыевіч Шэйграцаў, Надзея Якаўлеўна Казлова, Васіль Сцяпанавіч Манкевіч, Карп Фёдаравіч Пацяробкін.**
*__Другі рад, злева направа:__* **Аляксандра Гаўрылаўна Шалкоўская, Мікалай Антонавіч Зайцаў, Ганна Міхайлаўна Новікава, Надзея Ягораўна Марозава.**

***Фотаздымак 1950-х г.г.***
***З фондаў гісторыка-краязнаўчага музея Брылеўскай школы.***



*__Унізе:__* **Валянціна Макараўна Мяшкова, Георгій Аркадзьевіч Ахраловіч.**
*__Стаяць:__* **Жана Фёдараўна Кавалёва, Галіна Міхайлаўна Андрэева, Раіса Аркадзьеўна Касмачова, Людміла Анатольеўна *(прозвішча невядома)*, Валянціна Аляксандраўна Ахраловіч, Людміла Аляксееўна Карась, Таццяна Фёдараўна Башарымава, Ірына Міхайлаўна Фаміна.**

***Верасень 1981 г.***

***З сямейнага архіва Валянціны Макараўны Мяшковай.***

# Гартаючы пажоўклыя старонкі...

**За камуністычную ПРАЦУ** *12 верасня 1989 года*

## Школьнае жыццё

# На святочнай лінейцы



Толькі 1 верасня можна ўбачыць столькі букетаў кветак, сустрэць столькі ўсмешак на тварах дзяцей і дарослых. Дзень ведаў - гэта свята не толькі вучняў. Гэта свята агульнае. У кожнага з нас была ў жыцці школа, быў першы і апошні званок. І кожны чалавек, колькі б яму ні было гадоў, памятае сваю першую настаўніцу…

Па - рознаму адзначаюць гэта свята ў школах, розныя склаліся традыцыі яго правядзення. У Брылеўскай васьмігодцы, напрыклад, Дзень ведаў пачаўся, як заўсёды, з ганаровай лінейкі ў прышкольным парку каля помніка загінуўшым савецкім воінам. Са святам цёпла павіншаваў прысутных дырэктар школы М. В. Фёдараў. З прывітальным словам выступіў старшыня калгаса імя Ільіча А.В. Кузняцоў. Аляксандр Віктаравіч паведаміў прыемную навіну: за аказаную ў час летніх канікулаў калгасу дапамогу рашэннем праўлення калгаса вучні старэйшых класаў Іван Сцепчанкаў, Аляксей Майстар і Юра Селюкоў прэміраваны каштоўнымі падарункамі - наручнымі гадзіннікамі "Ракета". Аляксей і Юрый вось ужо другое жніво запар з'яўляюцца памочнікамі камбайнёраў у сваіх бацькоў Уладзіміра Сцяпанавіча і Аляксандра Цімафеевіча. Сямейны экіпаж Селюковых, працуючы на камбайне "Ніва", выдаў сёлета "на-гара" 292 тоны зерня. Асаблівых поспехаў дабіліся бацька і сын Майстар. Працуючы на камбайне "Дон-1500", яны намалацілі 623 тоны і занялі першае месца ў спаборніцтве сярод камбайнёраў гаспадаркі. Іван Сцепчанкаў вызначыўся на калгасным зернетаку.

*М.ЯЦКОЎ.*



**НА ЗДЫМКАХ:** першы раз у першы клас; старшыня калгаса А.В.Кузняцоў уручае каштоўныя падарункі вызначыўшымся ў працы вучням.

*Фота аўтара.*



# Дзеці казкі малявалі...

## 1984 г.

*Малюнак Валерыя БУРАЕВА.*

*Малюнак Яўгена БУРАЕВА.*



*Малюнак Сяргея БЯЗРУЧКІНА.*



наш Архіў

**Грамадска-гістарычны бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.**
**Распаўсюджваецца бясплатна.**
**Наклад 50 асобнікаў.**

**Адрас для карэспандэнцыі:**
**213107 Магілёўскі раён п/а Брылі**
**тэл. маб. 3732886**
**e-mail: nvff@rambler.ru**
**© “Брылеўская мінуўшчына”, 2006**

**Заснавальнік і рэдактар**
**Мікола ЯЦКОЎ**